Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцii і адміністрацii: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціi. Рэдакція пак дае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 13 Лістапада 1914 г. № 45

*Усім, хто перад Новым Годам захочэ абзнаеміцца з „Нашай Нівай“, калі прышле свой адрэс, то кантора Рэдакціi будзе высылаць газэту да Новаю Году ДАРМА.*

# ВАЙНА.

**Расейска-Аўстрыяцкая.**

Наступаньне расейскага войска ў Заходняй Галіччыне не спынялося праз увесь тыдзень, пры гэтым, расейцы занялі Вісніч, Горліцэ, Дуклу, Ужок, Новы Сандэц. У бітвах за 8 лістапада узята у палон 5000 з лішнім аўстрыякоў.

**Расейска-Нямецкая.**

Паміж Віслай і Вартай увесь тыдзень не спыняліся заўзятые і крывавые бітвы. Немцы намагалі тут усімі сіламі, на распалажэньня расейскага войска, каб такім чынам прабіцца ізноў к Варшаве. Асабліва упорны і заядлы характэр апошнім часам маюць бітвы у раёне на поўнач ад Лодзі. У гэтых бітвах расейцы узялі неколькі кулемётоў і колькісот палонных. 10 лістапада заўважана атход немцоў на гэтым фронце з ліній Стрыков—Згеж—Шадэк—Здуньска Воля—Возьнікі. 11 лістапада. Лодзінская барацьба не спыняецца. У адным с пунктоў яе расейская конніца атакавала у конным строю атступаўшую нямецкую пяхоту, нанесла ёй вялікіе страты і захапіла цяжкіе арудзіі.

На фронце Чэнстахова—Краков так сама ідуць крывавые і заўзятые бітвы, але перэвагі на тую ці другую старану з вестак ад Штабу Верхоўнага Глаўнакамандуючаго не відаць было. Толькі апошняя вестка з 11 лістапада такая: На фронце Чэнстахова—Краков барацьба развіваецца карысна для нас. За 9 лістапада узята 6000 з лішнім палонных. Проба праціўніка пераходзіць у контр-атакі намі адбіты.

У Ўсходней Прусіі на фронце Гумбінен — Ангербург расейскае войска з боем пасовываецца наперад. Атакавала сільна умацованые непрыяцельскіе пазыціi к усходу ад Ангербургу. У гэтым мейсцы перад нямецкімі акопамі ідуць тры рады драцяных загародаў, вадзяные канавы і драцяные сеткі, што вельмі затрудняе наступаньне. У бітвах на гэтым фронце расейцы ўзялі 19 арудзій, 6 кулемётаў і неколькісот палонных.

**Расейска-Турэцкая.**

У канцы мінуўшага тыдню расейскае войска адыйшло ад пазыціi Кепрыкея. Турэцкае войска мецілася наступаць у даліне Ольты-чая, на чорнаморскім узбярэжы каля граніцы Батумскай обласьці, а курдская конніца такжэ каля Азэрбэйджану. Але ўсе пробы турэцкаго наступаньня карысьці для іх вялікай ня мелі. Апошнімі часамі прыйшлі весткі, што ад Ольты-чая туркі аткінуты к Бару, а на эрзерумскім напрамку разьбіты каля Юз-Вэрэра. Раней яшчэ расейцы узялі Дытах на шляху к Маласгерду і Мушу. За 9 лістапада на эрзерумскім напрамку пярэдніе атрады расейцоў не пакідалі націскаць на праціўніка, пры гэтым захапілі яшчыкі з набоямі, абоз і баевые прыпасы. На поўдня ад Кіракаліссы Алашкерскай былі удачные для расейцоў стычкі у некалькіх напрамках с курдамі, усіленымі рэгулярным войскам. У Азэрбэйджане расейцы патурбавалі у колькі мейсцох туркоў, пры чым захапілі часьць турэцкай артылерыі. 10 лістапада развіваліся стычкі у Чорохскім краю. На эрзерумскім напрамку праціўнік, аткінутый на ўсім фронце, змушэны к пасьпешнаму атступленьню; расейскае войска энэртічна гоніць яго.

**Француска-Англіцка-Бэльгійска-Нямецкая.**

Весткі з гэтаго тэатру праз увесь тыдзень нічога важнаго для тэй ці другой стараны не прыносілі. Атакі немцоў, асабліва паміж морэм і Іпрам, не спыняліся, але вялікай вагі ня мелі. Агулам на гэтым полі бітвы даецца заўважыць змучэньне з абадзьвух старон, пры гэтым, асеньняя пагода і паводкі так сама замінаюць акуратным ваенным змаганьням. Усілены рух немцоў заўважэна 9 лістапада: цэлы гэты дзень ішла заўзятая стрэляніна нямецкай артылерыі, скераваная асабліва проці Іпру, у якім загарэліся катэдральная званьніца, тарговые двары і шмат дамоў. Абстрэліваны такжэ Суассон і Рэймс. Адбываліся гарачые бітвы у Аргонах. Немцы кідаліся у вельмі заўзятые атакі, якіе аднак былі адбіты.

**Вайна на моры.**

7 лістапада раніцай турэцкі крэйсер «Гамідіэ» з некалькі мінаносцамі падыйшоў к Туапсэ (расейскі горад на берэзе Чорнаго мора) і пачаў бомбардоўку, выпусьціўшы каля 125 знарадоў. Расейская артылерыя зараз-жэ пачала атстрэлівацца і прыцэлы яе былі удачнымі. Ранена трох салдат і сестра міласэрдзя. З жыхароў - забіты адзін і пацярпела да 10 людзей. Матэр'яльные шкоды не вялікіе.

З Гаагі (Голандзія) тэлеграфуюць, што на Паўночным моры адбылася бітва паміж нямецкай і англіцкай эскадрамі. У часе бітвы узнялася страшэнная бура з громам і пярунамі. Раскаты грому заглушалі канонаду (стрэляніну) арудзій і безупынные блыскавіцы асьветлялі грандыозны вобраз бітвы, адбываючэйся пры такіх рэдкіх абставінах. У Остэндэ, дзякуючы сільнаму марскому ветру, чуваць была гарматняя канонада.

**Вайна у паветры.**

Атрад француских лятуноў напаў на нямецкую фабрыку цэппэлінoў у Фрыдрыхсгафэне, дзе пад сільным агнём непрыяцельскай артылерыі і кулямётаў лятуны спусьціліся і кінулі некалькі бомбаў, прычыніўшы немалые шкоды гэтай фабрыцэ. У другім мейсцы, у Зэебрюгге, англіцкі лятун узарваў бомбай нямецкую фабрыку, дзе будаваліся падводные лодкі.

---

**У Нямеччыне.** Прыехаўшый у Бухарэст (Румынія) з Бэрліну расейскі ваенны доктар, узяты у палон на расейска-прускім тэатры і увольнены павэдлуг ваенных законоў, паведамляе, што каля Бэрліну строюцца вельмі сільные укрэпленьня і будуецца вялікі мост пры ўплыве Варты у Одэр. На пастройках заняты тысячы работнікоў. Навезена вельмі шмат жалезных і іншых матэр'ялаў. Строюцца форты і ўстанаўліваюцца арудзіі. Пры пераходзе поездоў каля гэтаго мейсца у вагоны уводзяцца усіленые патрулі, дзьверы зачыняюць і пасажырам загадываюць сядзець, апусьціўшы галаву, і не глядзець у вокны.

Павэдлуг вестак с Копэнгагена (Данія), нямецкая армія складаецца с 4 мільёнай людзей і падзеленая на 99 корпусоў.

**К вайне на Захадзе.** Павэдлуг апошніх вестак, узняўшаяся сьнежная бура замінае вясьці як сьлед вайну і прымусіла абедзьве стараны спыніць бітвы. За восем дзён безупыннай барацьбы бэльгійскае войска пазбылося 18,000 людзей. Цяпер усяго асталося 25,000, і яны далі зарок бараніць бацькоўшчыну да апошніх сіл.— За апошнюю нядзелю у бітвах пад Іпрам абедзьве арміі (француская і нямецкая) на столькі адна к аднэй прыбліжыліся, што ня могуць высылаць разведчыкоў і ставіць форпосты (пярэднюю страж). Усё войска хаваецца у акопах Неколькі дзён таму назад, акопы праціўнікаў зьбліжыліся на 50 сажон. — Англіцкі карэспандэнт пішэ: «Наступіўшые у апошніе дні халады вельмі даюцца у знакі засеўшым у траншэях. Дастаўляные у нашы бальніцы лёгка раненые—людзі, закачанеўшые ад холаду, чуць трымаюцца на нагах і ледзьве магуць ўладаць аружжэм. Срогі мсціцель—зіма—набліжаецца. Разграбленые і разрушэные гарады і вёскі кепска спаткаюць непрыяцельскую армію, як яна рушыцца к сабе дамоў».—С Парыжу паведамляюць, што у Лільлі пануе пошэсьць тыфусу. Неваенные жыхары з дазваленьня абядзьвух ваюючых старон уцекаюць з гораду.

**У Болгарыі.** Болгарыя, Турэччына, Нямеччына і Аўстрыя зрабілі паміж сабой умову, па якой гэтые супольнікі будуць памагаць адзін аднаму у сваіх справах за рахунак другіх балканскіх дзержавоў. Кажуць што гэта умова скіравана проці Расеі і Англіі. — Па загаду болгарскаго ўраду, усе прыстані каралеўства закрыты для тарговых караблёў. — Болгарскіе націоналісты выдалі маніфэст к народу, у каторым даводзюць, што цяперашняя палітыка Болгарыі павінна кіравацца к таму, каб была звернена болгарам Македонія, атказ ад Добруджы, дружба с Турэччынай, зварот Сэрбіей і Грэціей аднятых у Болгарыі зямель. Маніфэст заканчываецца славамі: «Македонія наша і мы яе возьмем».

**У Італіі.** Італьянскі урад, баючыся, што сьвяшчэнная вайна, апавешчэная у Константынопалі Расеі, Франціі і Англіі, перакінецца у Трыполітанію і Кірэнаіку, жыхары каторай ешчэ не зусім супакоены, пасылаець туды войска.

У **Турэччыне**. Шэйх уль-іслам (вышэйшы духоўны чын у магамэтан) выдаў фетву (адозву), забараняючую туркам службу у армян, а такжэ службу у Англіі, Франціі і Расеі. — Турэччына не пакідае хлапатаць у Пэрсіі, каб гэта апошняя выступіла процi Расеі. Султан атправіў шаху асабліваго пасланца с пісьмом у якім звертаючы увагу на супольнасьць національных інтэрэсаў, угаварывае таго падняць мусульман.

У **Грэціі**. Тутака чэкаюць з мінуты на мінуту турэцкаго выступленьня процi Грэціі. Вартаўнічые караблі грэцкай эскадры падбліжэны к Дарданэлам.

У **Эгіпце**. С Каіру паведамляюць, што ў скорым часе на ўсход ад Суэцкаго каналу спадзяюцца вялікай барацьбы. Англічане, апрача наладжэных украпленьнеў, разрушылі і засыпалі усе студні у пустыні, каб перашкодзіць турэцкаму наступанью. Гарнізон Каіру значна павялічэны.—У Эгіпце адбылася невялікая бітва паміж непрыяцелем і атрадам англіцкіх ездакоў на верблюдах. Непрыяцелю прычынены значные шкоды. Англічане страцілі 13 людзей, згінуўшых бяз весьці.

## Каля вайны.

### У крывавым віхры.

Круглае чырвона-агнявое сонцэ спускалася на захад, калі мы падыйшлі да вёскі, за каторай павінна была быць вялікая бітва. Мы бачылі асобные хаты, на палову разрушэные адыйшоўшым непрыяцелям Ля аднаго ганку с трыма ўсходкамі лежаў кіняны жаноцкі чаравік, малюсенькі і чысьценькі... І дзіўна было яго бачыць у гэтай незвычайнай абстанові.

Чуваць каманда... Услыховываюся... Сыгнал... Трэба прыгатавацца... Яшчэ часіна, тры, пяць часін і заб'юць у барабаны... Пачнемо наступаць... Я загадываю... Мой конь пачынае скакаць, быццам прачуваючы штось нядобрае... Я азіраюся назад.. Шмат галоў... Даўгі, даўгі, шырокі сьцяг людзей цягнецца да мяне, замешанаго сярод іх на сваім кані. Сонцэ ўжо схавалося... пагасло... Чорная лахманая хмара павісла і шэры вячэрні цень цікуе на зямлю. Узноў сыгнал... праразлівы і галосны... б'юць у барабаны...—Трр-та-та-та! Барабаненьне перарывае цішыню, палахліва ўздрыгіваючую сярод гэтулькі людзей. Узняўшыся вецяр даносіць галасы камандзераў...

—Першая рота.. Налева, марш... Правы фланг бліжэй! У калонны!.. У ат-таку!..

Часінка, і ўсё зліваецца ў адзін агульны пякельны грукат... Непрыяцель стрэляе... Пачынаецца стрэляньне з гармат. Ад іх стуку трасецца земля. Дым клубамі ўецца над людзьмі. Жду свайго чароду.. Ен блізкі... Да страшэннаго стуку і крыку я с пачатку не магу прывыкнуць. У галаве шуміць, ў вочах мятусяцца кро́пінкі. Загудзела куля... Другая, трэцьцяя.. Як мухі... Нахінаешся да шыі каня.

— Дзякуй Богу, жывы! міхціць у галаве. Кроў вытнула ў галаву. Гляджу ўперад. Мае салдаты жывые—ніхто не забіты, ніхто не ранены. А бітва большае і шырыцца. Каманда нясьціхае Мамэнтам чуваць невыразные галасы камандзераў. І, калі чуеш галасы, на душы робіцца лягчэй. Я ўжо на перадзі. Яшчэ некалькі часін і пападу ў вір барацьбы. Хтось паваліўся. схапіўшыся за галаву... Пальцы рук пачырванелі.. Гэта кроў, чырвоная, яркая... Ўзноў валіцца хтось... Яшчэ і яшчэ...

— Гарой, гарой!—крычаць каля мяне.—Браткі, ў штыкі!

Падняўся слуп дыму, ён асьляпіў і аглушыў мяне... Куля раніла майго каня і я зваліўся, закруціўшыся ў крывавым віхры. І калі абапёршыся на руках крышку надняўся, ўбачыў нечую адарваную нагу у запыляным і ўкрываўленым боце. Ля мяне прайшлі новые хвалі нашых салдатоў. А кулі гудзяць і гудзяць, як мухі. З заду нас, у сяле, ад снарадаў загарэліся хаты. Вялізарнымі чырвонымі зьмеямі пырскалі і віліся знарады, і раўлі, і шыпелі, як кіпучая смала у катле. Міма мяне беглі наперад салдаты і вялікім націскам аткінулі аўстрыякоў. Мятусіліся твары, шэрые, ў поце, с пырскамі крыві, з бліскучымі, як у гарачцэ. вачыма.

Апошні вялікі націск... Непрыяцель разбіты, раздушэны. Наш верх. Я ўбегаю у сярэдзіну адходзючаго непрыяцеля, каторы неўспадзеўкі стаў заўзята бараніцца. Рука махае шашкай, нечыя кроў пырснула ў мой твар. Нечые вочы блішчаць каля маіх вочаў.. Мамэнт, і я валюся ад удару аўстрыяцкае шашкі па галаве. У распаленых мазгох мятусяцца думкі: «Ранены, баліць, раздушуць ботамі..» У ваччу цямнее... Гарачая ліпкая кроў паўзе за каўнер...

Атчыняю вочы. Адразу не магу зразумець дзе я. Прыпамінаю... Я ранены... Угледаюся... Каля мяне гэткіе-ж раненые, як і я. хтось стогне і плачэ... Павевае прыемны ветрык...

— Мяне згледзілі. перавязалі!—думаю я, і мне робіцца лягчэй на душы.

## Беларусы на вайне.



*Александр Цюндзевіцкі*, паручык драгунскаго палку, барысавец. Захварэў на вайне, лечыцца у Дваранскім шпіталю у Вільні.



*Рыгор Лашчэускі*, барысавец, салдат пехотнаго палку. Дастаў за адвагу, выказаную на вайне на Прускім фронце, Георгіеўскі крыж і мэдаль.

## Жыла, жывец і будзе жыць!..

*(К гадоушчыне «Нашай Нівы»).*

Пакратай мінуўшчыны попел,
Што у казках ня кінула жыць...
*Я. Купала.*

Жыла. жыве і будзе жыць душа народу нашаго!..

Душа народу нашаго гэта тая пад'земная, імпэтная моц жывой крыніцы, каторая, знайходзючыся пад каменным пластам, шукаець сабе болей рыхлаго слою зямлі для выхаду у верх. І напор той маець гэткую сілу у сабе, што, ня гледзючы ні на якіе перашкоды, нарэшці, ўсё-ж такі, вырываецца да сонейка і разбіваючыся цудоўным фонтанам, разыйходзіцца па лугох-палёх ручайкамі, разліваецца на бязмерные абшары, падыймаючы свой зычны кліч: «Жыла, жывець і будзе жыць!..»

Душа народу нашаго—гэта тая, жывая кіпучая кроў у жылах, тыя пачуцьці і думкі у сэрцы, якіе перэдаюцца нам, як спадчына, ад роду у род... У сваей самабытнасьці, у сваей іначэсьці ад другіх выяўляець яна свой блеск, сваю неацэненую вартасьць як для сваіх, так і для чужых, акружаючых яе.

Душа народу нашаго жыла у благіх гістарычных варунках,

## Акорды мора.

Морэ!..

Якая бязмернасьць!.. які абшар!.. Колькі зычных песьнёў аб табе пеялі, колькі дзіўных казак аб табе складалі!.. Морэ!.. Душа мая у палоне у гуду тваім грозным, а сэрцэ, як дзіця да маткі-радзіцелькі, рвецца у шырокіе абоймы твае...

Малады рыбалоў пазіраець арлінымі вачыма сваімі на неба, шукаючы хмары небаспечнай, бурнай; ён варожыць, ці можна выбрацца з гнезда-затокі на абшырнае морэ. Ён кямлівым вокам сваім якбы нашчупываець далі неясные, дзе неба да мора даходзіць, і адвага родзіцца ў душы яго. Грудзі яго калышуцца ад сьвежасьці морскай, кроў гарачая перэліваецца у жылах, вочы гарaць, і буйная радасьць абхопліваець аго ўсяго... — Морэ!.. — вырываецца слова з яго грудзей. Колькі сілы і шчасьця, моладасьці ёсьць у гэтым слове!..— Морэ!.. Ён тут радзіўся чуць не сярод самых хваль у хаціне беднай, ён сабе і магілу знойдзе у сівых грудзях хваль...

Часамі морэ бурыцца-шуміць. Ўся затока дрыжыць; тады і яго хацінка ўся у кроплях пеністых зіхаціцца... Маці моліцца перэд бажніцай у страху вялікім, а радасьць рыбалова яшчэ болей павялічываецца... Нібы чайка жвавая, рвецца ён да хваль ўзбунтаваных і раз'юшэных... Морэ! — кажуць адно імя твае яго вусны і гэта выходзіць шчырай малітвай-песьняй грознаму богу марскому... Калі часамі аб моцные грудзі малойца удараецца смутак вялікі сваім крыльлем чорным, калі абхопліваець яго душу атрута каханьня нешчаснаго, калі ён бачыць, што яго галубку-мілую абыймаець, цалуець другі, — ён шукаець забыцьця непрытомнаго у самай сэрцавіне мора, і ціхаміріцца яго боль...

* * *

У гэтую восень старые рыбаловы шмат зданьня і страхацьця бачылі на моры вачыма сваімі. Аб гэтым яны расказывалі, бажыліся, і палохаліся выехаць у чыстае морэ.

Небо было шэрае. хмурнае, морэ аддыхало, якбы чэкаючы буры-гульні Ніхто цяпер не адважыўся-бы выехаць на чоўні рыбацкім А маладога рыбалова пацягнула яшчэ болей... Ён ня мог устрымацца: адвязаў човен свой і выбраўся з затокі на абшырнае морэ. Нехта якбы клікаў яго туды, нешта цягнула сілай вялікай і невядомай... Ён ужо ад'ехаўся досіць далёка ад роднаго берагу. Морэ злёгку зыбыцца пачало. Небо пацямнела.

Гу-гу-гу-гу-у-у-у! — раздаўся падводны працяглы звон... Г-г-гм-м-м! — паняслося рыканьне таёмнаго зьвера...

Ой, хутка запеніцца мора, і пачне у гульні непрытомнай скокі свае ладзіць!.. Хвалі, як раз'юшэные, вялізарные, казачные коні на дыбкі да самых воблакоў патскочуць!.. Закіпіць, загарыць чорная, страшная бяздоннасьць, нібы пекла шалёнае!.. Страшыдлы, дзеці глыбокаго дна морскаго, павылазюць у верх с самай нізіны і навострацць клыкі, ахвяр чэкаючы!... Запяець морэ песьню сваю грымотную, пабедную і заглушыць ўвесь сьвет! Хмары алавяные у ніз апусьцюцца, горы вадзяные ў верх падыймуцца і ўсяму канец...

Ты, рыбалоў малады, толькі на сьмерць выехаў цяпер на начоўках сваіх..

А-а-а-а! А-а-а-а!—сапець нехта вельмі вялізарны. Ці гэта ён змарыўся? Не! — гэта бура пайшла сабе калыхаць морэ, на забаву пайшла... Пацямнела. Човен закалыхаўся, як трэсачка, то падыймаючыся на самы карк хвалі высокай, то апускаючыся у самы ніз яміны глыбокай. Гульня-бура пачалася. Што значэ і найвялікшы адважнік перад гэткай сілай! Самае асвоенае вуха рыбалова глушыцца ад гэткаго дзікаго крыку.

Жмурыць вочы свае рыбалоў малады.. Над ім хвалі, пад ім хвалі, увакруг хвалі. Болей маці не убачыць яго... Ён прадсмертна выспаведаўся у сэрцы сваім, і ўжо гатоў... Супакоен...

Але што гэта бачыць ён здалёку на цёмным абшары? Караблі! Божухна: во дзе яму ратунак будзе! во дзе! Вялізарные караблі патплылі бліжэй.. Тарчаць ўвакруг цёмные жорлы гарматоў... Вада робіцца чырвоная... Караблі яшчэ бліжэй патплываюць да яго... Робіцца ціха; бура хутка зусім заснула. Угледаецца ён у караблі і дзіву даецца, чаму гэтак ціха... угледаецца... і, крык вялікаго страху і жудасьці вырываецца зяго грудзей: а на пакладзінах караблёў лежаць цэлые груды мерцьвякоў з вытарашчэнымі вачыма.. Ен жэгнаецца... Караблі далей паплылі, але морэ асталося чырвоным, і хмары пад небам зрабіліся чырвоные і ўсё пачырванела... У адным мейсцы процьма аткрылася і вылез адтуль бог мора, высокі, з доўгай зялёнай барадой, падобнай да ўсьпененых хваль. Яго акружылі русалкі. Вочы бога маланкі сыпалі ад злосьці вялікай, русалкі ажна дрыжэлі ад страху, косы свае расплетаючы..

Залішне ахвяр!—што мне з імі рабіць?—злуецца бог мора,—што? Мейсца німа для іх, ахвярнік мора перапоўнены ўжо!

С-пад хваль павылазілі тым-часам страшные грамадзіны бяздоньня. Вочы іх смагай дзікай блішчэлі, ляпы разьзявіліся ад вялікаго голаду...

— Яшчэ дайце! яшчэ!—хрыпелі яны: Мы галодны! граніц німа галоду нашаму!—І выставулялі у верх касматые рукі з закручэнымі кіпцямі... Морэ закіпело як вялізарны кацёл.. Усё зварушылася у дзікім карагоду... Нешта равела хрыплым, магільным голасам... Пасьля ўсё збялело, як малако, сціхло і спусьціўся з высот белы анёл. Ен трымаў у руках сваіх залатую міску, дзе лежало жывое сэрцэ чэлавека і трапеталося... Крыльлем сваім анёл сеяў авакруг па хвалях кроплі нейкай дзіўнай белі, ад каторай ўсё рабілося бела, ажна сьляпіла бельлю сваей, але сэрцэ гэтак моцна білася у місцы залатой, што кроплі крыві пыр-

жыла пад няволяй у другіх, мацнейшых, каторые хацелі сцёрці яе самабытнасьць, але такі ніякай рады не далі,—і пры першай бліскавіцы сведомасьці чужы налёт пачаў разсевацца, як попел ветрам, а душа народу пачала красавацца у сваей чыстаце і блеску..

Колькі трагізму было у гісторыі народу нашаго! Колькі цемнаты і нядолі! Колькі вызыску яго рознымі грубымі сіламі! Колькі болю і сьлёз, пачынаючы ад часу прыгону! Здавалося ўжо ворагі краю беларускаго свайго дасьцігли, дабіліся таго, што шмат з нашых братоў ахвяравалі свае сілы чужым, запрадалі ім душы свае.. Узгадаваные на руках пакутніка-ратая, гэтые атступнікі выкпівалі яго, адракліся памагаць чым колечы «хаму-мужыку...» Дайшло да таго, што «хам» гэты думаў, нібы ён прапашчы навекі чэлавек; нібы ён ніжэйшае стварэньне ад другіх «поноў, багатых ды адукаваных разумнікоў». Ўжо, здавалося, канец, магіла .. Але сваім чародам, па закону прызначэным ад прыроды душа беларуская: «Жыла, жывець і будзе жыць!»

Душа народу, ня гледзючы на нішто, гадавалася у творчасьці, харастве. У песьнях сумных і вясёлых, у вырабах: тканінах, рэзьбах і г. д.—яна вылівала затаеные думкі свае і такім парадкам тварыла нам свае скарбы, пісала сваю летапісь—Евангельле... Несьвядома йшла барацьба духу беларускаго з усім для яго шкадлівым. Што гэта? што гэта?—пыталося само сэрцэ народнае. Мы жыць хочэм! жыць хочэм!.. атказывало яно самаму сабе кожны раз.. і як блізкі, зразумелы былі народу гэтые чулые струны сэрца!.. Нешта да болі, да сьлёз кратало, будзіло сыноў Беларусі-Маткі да вольнаго, сьветлаго жыцьця, да пазнаньня сваей вялікай вартасьці.

«Жыла, жывець і будзе жыць!..» Гэты міфічны кліч восем гадоў таму назад пабудзіў выліцца думы сэрца народнаго у болей рэальные і відзімые формы. Паявілася у сьвет першае сьвядомае беларускае друкаванае слова—«Наша Доля», а усьлед за ею—«*Наша Ніва*».

«Наша Ніва» — не гаворучы аб іншых розных беларускіх часопісях,—ад пачатку свайго паяўленьня у сьвет па сягоньняшні дзень гэта чыста народная часопісь, у якой ясна адбіваецца думка нашых мазольных братоў з розных глухіх кутkoў Беларусі. С кожным годам паяўляюцца на ніве роднай ўсё новые і новые сілы. С кожным годам наша родная мова на страніцах «Нашай Нівы» «шліфуецца-гартуецца», робіцца ўсё болей чыстай, гібкай і выразнай, робіцца здатнай да малеваньня самых чуць ухопных пачуцьцёў душы і зьвініць, як той жаўронак вясною над сьвежай ральлёй, як тая дудка хлопчыка пастуха на лузе..

І большая частка братоў нашых ўжо пачынае разумець, што мова наша ня ёсьць «простая», «хамская...». І вучоная моладзь наша—вучыцелі, студэнты, дактары, аграномы, інжэнеры і г. д.—ўжо не гаворуць і ня пішуць толькі на «панскіх» мозах, але самае першае мейсца займаець у іх свая родная...

«Наша Ніва» не прапаведуе сьляпога, шовіністычнаго націоналізму, але маець за закон: «Свайго не чурайся і чужога навучайся!». Мэта яе: праца шчырая і прасьветленьне роднай Белай Русі на эканамічным і культурным грунці. Праўда, шмат нападкоў маемо ад суседзяў сваіх, яны стараюцца чым болей каменьнёў накідаць на шляху нашым, але мы, не астанаўліваючыся, цьвёрда ідзём наперад.

І вось у часе гадоўшчыны «Нашае Нівы» мы сьмела кажэмо: «Жыла, жывець і будзе жыць Беларусь — маці!..» Мы у гэта сьвята верым!

**З. Б.**

---

## Бальляда.

Буйны вецер гудзіць; на здабычу ляціць
Грамада вараньня адзічэлая.
На мягкой на ральлі тарчыць з рыхлай зямлі
Без далоні рука пасінелая ..

То ваяка тут лёг, закапаў друг, як мог...
І не ладзілась песьня, хаўтурная,
Бо сьпяшыў ён дагнаць паляцеўшую рацъ,—
Была бітва крывавая, бурная...

І малы курганок без крыжа, адзінок,
Воўк данюхаў, разрыў яго з голаду.
Ад несмаку завыў, кінуў труп не пакрыў,
І рука злядзенела ад холаду...

Нібы Божая злосьць, тарчыць голая косьць
Безупынна дажджом абмываецца.
А паўночы глухой чуваць стогн пад зямлёй,
То нябошчык сапець, падыймаецца...

Як спрасоньня глядзіць, дзе дружына стаіць,
І чаму тут так ціха—ня ведаець...
Ен на поле, на луг пагледае ўвакруг—
Ці-ж то полк аддыхаець, абедаець?..

І ляціць па палёх, па сырых курганох,
Да зямлі часамі вухам прыложыцца.
«Ўжо гарматы равуць... мухі сьмерці лятуць..
І нябошчык шчэ болей трывожыцца...

І ляціць і глядзіць... Блізка вёска гарыць,
Плачэ дзед з болем рукі ламаючы.
Цякуць сьлёзы з вачэй, рвуцца стогны з грудзей
Аб далёкіх сваіх ўспамінаючы...

Вецер раніцы дзьмець. Пачынае шарэць.
Да магілы сваей труп вертаецца.
Нібы Божая злосьць, тарчыць голая косьць,
Безупынна дажджом абмываецца...

**Ясакар.**

Вільня 2/XI—14 г.

---

## З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

**Горэцкі ранены.** Наш вядомы пісьменнік М. Горэцкі, якога фатаграфія была надрукована у № 37 «Н. Н.», ранены у нагу і цяпер лечыцца у Вільні у шпіталі.

**„Camilius“ жыве.** Надрукаваная у нас вестка, узятая с польскіх газэт, што вядомы маляр Каміль Мацкевіч забіты на вайне, аказалася на шчасьце памылковай. Надовічы прыйшло пісьмо, што «Camilius» не забіты, а толькі папаў у палон. Адрэс яго такі: Германія. Hamerstejn, West-Preussen, Lager 4 Compagnie dem Rusische Gefange Camil Mackiewicz.

**Абавязываючые пастановы.** Пад штрафам да 3000 руб. або да 3-х месяцоў турмы: 1) забараняецца купляць коні, залічэных да конскаго запасу, без асаблівых сьвядоцтваў у якіх паказано, што коні прададзены за непрыгоднасьцю для войска. А хто ўжо раней купіў такіе коні, той павінен паведаміць аб гэтым паліцію. 2) Забараняецца укрываць знойдзеные на полі бітвоў ваенные стрэльбы. Знойдзеные стрэльбы павінны быць абавязкова дастаўляны да ваенных начальнікоў гаспадарскіх аддзелоў арміі, або да этапных і жалезнадарожных камэндантоў; за кожную дастаўленую расейскую стрэльбу будзе заплачэна 6 р., а за непрыяцельскую—5 р.

**Аб дворніках.** Віленскі паліцмэйстар загадаў прыставом у найкарацейшы срок прыгатаваць спіскі дворнікоў і зрабіць у сыскном аддзеленьні праверку, ці ня быў каторы з дворнікоў пад судам або следзтвам і ці ня быў заўважаны у якіх колечы праступках. Аднычасьне з гэтым загадано прыставом узяць з дамаўласьнікоў патпіску аб тым, што яны, прыймаючы на службу вовых дворнікоў, будуць паведамляць аб кандыдатах у належачые участкі дзеля справок аб кандыдатах у сыскном аддзеленьні аб іх «благонадзёжнасьці». Нявыпоўненьне гэтаго домаўласьнікамі будзе карацца павэдлуг абавязываючых пастаноў штравам да 3000 р. або арыштам да 3-х месяцоў.

**Сем'яў, пакліканых на вайну запасных,** атрымліваючых казённую запамогу (паёк) налічываецца у гэтым часе у Вільне 4,208. Усіх членоў гэтых сем'яў 11,684, у гэ-

---

скалі з яго і расплываліся чырвонымі кругамі, нібы аграмадные зоры, фарбавалі бель...

Тым-часам у абшары заплакаў нехта плачэм вялікім: «Ой, баліць мне, баліць! ажно вы гаварыць німа як! Ніколі гэткай болі не было на сьвеце, ніколі... Хто гэта акрывавіў ўвесь сьвет? Чаму паднябесная ўся стогнамі напоўнена? чаму?»

І рвуцца з нейчых грудзей пытаньня балючые: «Чаму ціжару не здымаюць с кволых грудзей чэлавека? Чаму не зрываюць плеўку слепаты з вачэй яго? Чаму дзікі зьвер руйнаваньня у сэрцы яго раз'юшыўся? Чаму помста безжаласная яго сьцягам зрабілася? Чаму не разрываюць крывавых кайданоў на руках яго? Чаму кіпіць у душы яго вялікі гнеў?» І галосіць жаласна нехта па ўсім абшару вялікім.

— Яшчэ і яшчэ! — просюць с процьмы страшыдлы, мы — галодны, галодны!

Морэ супакоілося. Хваля данесла маладога рыбалова да самаго берагу, да рук матчыных... Спаў ён у сьне адвечным. Маці рукі ламала, галасіла над ім, нібы чайка на моры... А морэ нікому таёмных казак сваіх не гаварыло, толькі часамі, як вельмі ўжо разгулівалася, яно атуляло белымі брызгамі рыбацкую хацінку і выло, як непрытомнае...

**Змітрок Бядуля.**

---

## „Браварнічы“.

*Ахвярую Ю. і Н. Страшынскім.*

Халімона як-бы хто с толку зьбіў. Атрыцьце, што заўтра Усе Сьвятые, яго так узрушыла, нібы ён спаў, а яго раптам разбудзілі. Ніколі гэтаго нездарывалася. Сем'я Халімонава заўсёды пільнуецца гэтаго сьвята; яшчэ за колькі час уперад, бывала, вылічываюць на які дзень і у якім тыдню яно выпадзе. А як сёлета... ці можа, што вайна, ці мо, што навапольскі пазачыняны, дык і аб сьвяце ўжо меней думаецца... Толькі каб не адно здарэньне, дык Халімонавы не ведалі-б нават, што заўтра і сьвята!..

Заходзе, гэта, Халімонава суседка; глянула ў кут у другі, і кажэ:

— Мусіць вы заўтра не сьвяткуеце?

— А якое-ж сьвята!..

— Вот табе маеш!.. Ці не сяньне вы радзіліся, каб не знаць, што заўтра Усе Сьвятые?! У мяне ўжо і вуліца подмецена!

А мамачкі! У хаце Халімона раптам падняўся рух і суматоха. Бардзей, хто за венік, хто за анучку, хто за цэбар з вадой.—Пачалі прыбіраць. Толькі Халімон не кратаўся з мейсца, як прыцьвечаны; стаяў і нешта думаў.

А думаў ён аб тое.—Заўсёды гэтае сьвята праводзілася сваім звычным парадкам, ня зьменна дажыўшым і да нашых час. Мела яно, як той кажэ, свае традыцыі, абычаі. Зьбіраюцца грошы .. Нясуць папу; ён адбывае «закупную» імшу. Моляцца за нябошчыкоў. Потым... П'юць па чарцы—зноў за нябошчыкоў... Закусываюць і п'юць. Ну, а цяпер?..

«Што ж гэта будзе?.. Як жа гэта цяпер?»—Халімон хутчэй спачуў, чым уразумеў, што Усе Сьвятые сёлета адбудуцца не па звычайнаму; адна рэч зламала звычны ход гэтаго сьвята...—«Імшу закупіць можна, як і калісьці; у царкву і на магілкі сходзіць можна... Ну, а якжа з гарэлкай?... Дзе-ж яе вось здабыць цяпер?..»

І Халімон—хоць ён і ня горкі п'яніца—першы раз у жыцьці пачуў, як яму дорага чарка гарэлкі. Ужо жонка вымыла падлогу і прыбрала у хаце, а Халімон усё ешчэ хадзіў як непрытомны, шнырыў па кутках, нешта браў, нечагось шукаў, а потым і сам некуды знік..

З'явіўся ужо самым вечарам.

— Ганура! У цябе печка паліцца?..

— Чаго табе?..

— Дай сюды саганчык!..

Гануся глянула на Халімона.

— Дай, кажу, саганчык!—Халімон выняў с-пад палы фляшку нейкай бурды, а як выцягнуў корак—запахнула сівухай.

— Ці не манішся ты зліваць гэтае пашкудзтва у саганчык?—Перапалохалася Гануся.—Забрудзіш мне пасудзіну!

Халімон зарагатаў:

— Ты яшчэ не смакавала гэтаго «крупніку», дык і кажыш — «пашкудзтва», а ось як запрабуеш... Пальцы абліжыш!

Гануся усьмехнулася, а Халімон вытлумачыў:

— Сама-ж бо ведаеш: гарэлкі цяпер не здабыць. Трэсні лобам, не атчынюць...

— А шынкі?

— Шынкі?! Бытцым-бы маняцца атчыніць... Але толькі я добра тое ведаю, што покі іх атчынюць, дык і смаку ў гарэлцы забудзешся.

— Халімон прысеў каля печкі, зліў у саганок «палітурку», размешаў і паставіў на вугольчыкі.

— Глянь, глянь!.. Бачыш, як гатуецца! Дай сюды лыжку... Ось так! Гэты шумок...

Але тут Халімон скочыў, як асмалены. С печы бухнуў вялікі сноп агню і разліўся па падлозі; саганчык выкуліўся с прыпечку і пакаціўся да дзьвярэй. Падняўся перэпалох... Халімон скочыў да ложка, хапіў наўгад жончыну спадніцу, а Гануся—с таго імпэту—Халімонавы сьвяточные порткі... Дзеці прыцягнулі коўдру. — Так-сяк пажар абтушылі.

...А назаўтра пайшоўшы да цэрквы, Халімон нікому не хваліўся, чаму ён у абгарэлых портках, а каб гэтаго ня зглядзілі, ён шчыльна зашпіліў сваю вопратку на ўсе гузікі.

**Язэп Гаротны.**

